Адбыліся выбары вышэйшага кіраўніцтва Міжнароднага саюза электрасувязі - Генеральнага сакратара і намесніка Генеральнага сакратара на чарговы чатырохгадовы тэрмін

Дэлегацыя Рэспублікі Беларусь, якую ўзначальвае Міністрам сувязі і інфарматызацыі Шульган Канстанцін Канстанцінавіч, прымае ўдзел у 20-й Паўнамоцнай канферэнцыі Міжнароднага саюза электрасувязі 2018 года, якая праходзіць у перыяд з 29 кастрычніка па 16 лістапада 2018 года ў г. Дубай (Аб'яднаныя Арабскія Эміраты).

Сёння 1 лістапада 2018 года, адбыліся выбары вышэйшага кіраўніцтва Міжнароднага саюза электрасувязі - Генеральнага сакратара і намесніка Генеральнага сакратара на чарговы чатырохгадовы тэрмін.

У выніку падтрымкі Рэспублікі Беларусь і іншых дзяржаў-членаў МСЭ па выніках галасавання Генеральным сакратаром Міжнароднага саюза электрасувязі абраны грамадзянін КНР Хоулінь Чжао (паўторна); намеснікам Генеральнага сакратара Міжнароднага саюза электрасувязі абраны грамадзянін Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі Малькальм Джонсан (паўторна).

Выбраныя кіраўнікі Міжнароднага саюза электрасувязі ўступаюць у пасаду з 1 студзеня 2019 года.

Падчас удзелу ў Паўнамоцнай канферэнцыі МСЭ 2018 года Міністр сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь Шульган К. К. 1 лістапада 2018 года правёў перамовы з Міністрам лічбавага развіцця, сувязі і масавых камунікацый Расійскай Федэрацыі Наскова К.Ю. аб развіцці супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь з Расійскай Федэрацыяй у галіне лічбавізацыі і сувязі, а таксама наведаў Дубайскі цэнтр кібербяспекі.

Больш дэталёвая інфармацыя аб Паўнамоцнай канферэнцыі і МСЭ даступная на афіцыйным сайце МСЭ:
https://www.itu.int/web/pp-18/ru/;
вынікі галасавання пасля абвяшчэння даступныя па прамой спасылцы:
https://www.itu.int/web/pp-18/en/page/104-elections

Source URL: *https://mpt.gov.by/news/01-11-2018-3682*